# САМАСТОЙНАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫКАНАННІ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ

***Н.М. Панкова***
Філалагічны факультэт,
кафедра беларускай культуры і фалькларыстыкі

Выкладанне беларускай мовы (прафесійнай лексікі) на завочным факультэце мае сваю спецыфіку. Па-першае, гэты прадмет не адносіцца да спецыяльных, па-другое, колькасць аўдыторных гадзін абмежавана васьмю на групу і, па-трэцяе, толькі адна пятая студэнтаў (у сярэднім) кожнай групы здавалі цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай мове, у сувязі з чым маюць больш-менш прыстойную падрыхтоўку па ёй, астатнія ж, на жаль, не валодаюць нават школьным аб’ёмам ведаў па беларускай мове ў дастатковай ступені. Да таго ж, большая частка студэнтаў кожнай групы паступіла не адразу пасля школы, а з перапынкам у некалькі гадоў.

Для некаторых спецыяльнасцей (“Фізічная культура”, “Гісторыя” і інш.) запланавана кантрольная работа па азначаным курсе, што, на наш погляд, дапамагае студэнтам узнавіць школьныя веды па беларускай мове і ўдасканаліць іх у працэсе падрыхтоўкі кантрольнай работы. У яе ўключаны як уласнамоўныя заданні (запісаць словы па-беларуску, паставіць назоўнікі, дзеясловы, займеннікі ў пэўную форму і г.д.), так і заданні, звязаныя са спецыяльнай падрыхтоўкай студэнтаў, бо галоўная задача курса – падрыхтаваць спецыялістаў, якія будуць здольны выкарыстаць беларускую мову ў сваёй прафесійнай дзейнасці. У сувязі з гэтым, у кантрольную работу ўключаны заданні, якія дапамогуць студэнтам авалодаць спецыяльнай лексікай і развіць навыкі прымянення яе ў канкрэтнай сітуацыі. Сярод такіх заданняў можна вылучыць наступныя: пераклад тэксту па сваёй спецыяльнасці на беларускую мову, вызначэнне беларускамоўных асаблівасцей у перакладзеным тэксце, тлумачэнне спецыяльных тэрмінаў па-беларуску і інш. Неабходна адзначыць, што па свайму зместу ўсе заданні носяць практычны характар і прадугледжваюць авалоданне студэнтамі большасцю рацыянальна-лагічных метадаў пазнаваўчай дзейнасці (аналіз, сінтэз, параўнанне і інш.).

Усе гэтыя заданні выклікаюць неабходнасць самастойнай работы, бо на занятках выкладчык можа толькі азнаёміць студэнтаў з аб’ёмам

работы, даць узор выканання заданняў і парэкамендаваць патрэбную літаратуру.

Структурна самастойную работу студэнтаў завочнага факультэта можна падзяліць на дзве часткі: работа, якая арганізуецца выкладчыкам, і самастойная работа студэнтаў, якую яны арганізуюць так, як лічаць патрэбным, без непасрэднага кантролю з боку выкладчыка.

Такім чынам, арганізацыя самастойнай работы студэнтаў завочнага факультэта накіравана на вырашэнне наступных задач:

-паўтарэнне, замацаванне і абагульненне ведаў па беларускай мове, атрыманых у школе;

-удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

-актывізацыя вучэбнай і навукова–даследчыцкай дзейнасці студэнтаў.

-фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі на працягу ўсяго жыцця.

Сярод відаў самастойнай работы можна вылучыць наступныя:

1. Самастойная работа па ўзору (перанос вядомага спосаба ў аналагічную сітуацыю).

Напрыклад: *Утварыце прыналежныя прыметнікі, падбярыце да іх назоўнікі і запішыце словазлучэнні (напр.: дырэктар – дырэктараў аловак).* Або: *Запішыце дзеясловы ў формах 2-й асобы множнага ліку абвеснага і загаднага ладу (напр.: загадаць – загадаеце, загадайце).* Пазнаваўчая дзейнасць студэнтаў пры выкананні гэтых заданняў выяўляецца ў асэнсаванні, запамінанні і ўзнаўленні вучэбнага матэрыялу і прымяненні яго па ўзоры. Яе асноўная мэта – замацаванне ведаў, фарміраванне ўменняў і навыкаў.

2. Рэканструктыўна–варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосаба з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю). Напрыклад: *З перакладзенага тэксту выпішыце 7 тэрмінаў (тэрміналагічных словазлучэнняў) і дайце ім азначэнне, карыстаючыся тэрміналагічным ці тлумачальным слоўнікам (напр.: Феадалізм, -у, м. (ад лац. feudalis). Грамадска-эканамічная фармацыя, заснаваная на ўласнасці феадалаў на сродкі вытворчасці і няпоўнай уласнасці на прыгонных сялян. Перажыткі феадалізму.* На гэтым узроўні студэнт прымяняе вядомы спосаб, адаптуючы яго да новай сітуацыі.

3. Эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю).

Да такіх заданняў можна аднесці выяўленне ў тэксце асаблівасцей беларускай мовы (фанетычных, граматычных, лексічных і інш.). На гэтым узроўні патрабуецца аналіз сітуацыі (у прыведзеным прыкладзе – тэксту). Пры гэтым студэнт самастойна выбірае якія рысы ён можа вылучыць, у якой паслядоўнасці іх падаць і на якія акцэнтаваць асаблівую ўвагу. Дзякуючы гэтаму, самастойная работа набывае даследчы характар.

Крыніцай інфармацыі пры выкананні студэнтамі названых відаў самастойнай работы могуць выступаць:

- канспект ;
- друкаваныя матэрыялы;
- падручнікі і слоўнікі;
- матэрыялы на электронных носьбітах.

Самастойная работа студэнтаў можа быць паспяховай толькі ў выпадку яе правільнай арганізацыі, неабходнага метадычнага суправаджэння, дзейснага кантролю, абавязковай сістэматызацыі, а пры неабходнасці і карэктыроўкі ведаў, атрыманых студэнтамі самастойна. На жаль, гэты працэс звязаны з шэрагам праблем. Кантрольная работа запланавана на першым курсе завочнага факультэта. Студэнты ў большасці выпадкаў не маюць дастаткова сфарміраванага навыка самастойнай работы. Таму выкладчыку ў першую чаргу неабходна сфарміраваць у студэнтаў матывацыю пастаяннай самаадукацыі.

Важным змястоўным элементам самастойнай работы з’яўляецца работа студэнтаў над памылкамі, дапушчанымі пры выкананні запланаванай работы. Выкладчык толькі падкрэслівае словы і выразы, у якіх назіраецца памылковае напісанне ці ўжыванне, даючы студэнту мажлівасць разабрацца з імі самастойна, г.з. зрабіць гэтыя недахопы аб’ектамі свядомай мэтанакіраванай работы.

У якасці кантролю самастойнай работы студэнтаў прадугледжана абарона кантрольнай работы, у працэсе якой выкладчык выяўляе ступень авалодання студэнтамі матэрыялу. Студэнтам прапаноўваецца выканаць некалькі заданняў, аналагічных тым, якія былі ў кантрольнай рабоце, што адразу паказвае наколькі сур’ёзна кожны студэнт паставіўся да выканання пастаўленай задачы. На жаль, прыходзіцца сутыкацца і са з’явай несамастойнага выканання гэтай работы студэнтамі, што хутчэй за ўсё звязана з іх мінімальнымі базавымі ведамі па беларускай мове, няўменнем (а часам і нежаданнем) некаторых навучэнцаў арганізаваць сваю самастойную дзейнасць належным чынам.

Такім чынам, самастойная работа студэнтаў на завочным факультэце з'яўляецца натуральнай неабходнасцю працэса навучання. Пры выкананні кантрольных работ па беларускай мове (прафесійнай лексіцы) яе можна разглядаць як актыўную пазнаваўчую і творчую дзейнасць у працэсе засваення матэрыялу. Варта адзначыць таксама, што гэтая работа прадугледжвае самастойнае мысленне, якое выяўляецца ва ўменні зразумець задачу, знаходзіць шляхі яе рашэння, а таксама рабіць вывады з атрыманай інфармацыі. Выкладчыку пры гэтым неабходна арганізаваць і накіроўваць гэты працэс, каб самастойная работа стала неад'емлімай рысай асобы студэнта: неабходна растлумачыць не толькі, якія заданні неабходна выконваць, але і як выконваць. Усё вышэйсказанае прыводзіць да высновы, што засваенне беларускай мовы залежыць не толькі ад метадаў навучання, але і ад упартай і асэнсаванай самастойнай дзейнасці студэнтаў.